«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

"Выйшаў не ў той час і не ў тым месцы": гарадзенцу прысудзілі год калоніі за ўдзел у акцыі пратэсту

07.12.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Мікіта Аўдзік. Фота са старонкі ў "Аднакласніках"

У судзе Кастрычніцкага раёна Гродна 6 снежня пачаўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 35-гадовага повара-кандытара Мікіты Аўдзіка, абвінавачанага ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага часткай 1 артыкула 342 КК (арганізацыя або актыўны

ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Справу разглядаў суддзя Уладзімір Пазняк, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівала Алена Пронька.

Паводле абвінавачання, мужчына ўдзельнічаў у Маршы адзінства, які праходзіў у Гродне 6 верасня 2020 года, у 13: 20 стаяў у счэпцы каля дома №10 па вуліцы Гарнавых.

Аўдзік ўтрымліваўся пад вартай з 6 па 16 верасня спачатку ў ІЧУ, пасля чаго быў пераведзены ў турму Гродна.

Абвінавачаны абараняў сябе самастойна, патлумачыўшы, што можа абараняць свае правы без абаронцы і гэта не звязана з яго матэрыяльным становішчам.

Адносна абвінавачвання, Мікіта Аўдзік растлумачыў, што прызнае віну часткова, паколькі сапраўды знаходзіўся ў названым месцы пры названых абставінах прыкладна 20 хвілін, аднак адмаўляе факт папярэдняй змовы і той факт, што ён нібыта загадзя ведаў пра мерапрыемства, якое праводзіцца.

Мікіта Аўдзік таксама адзначыў, што не каардынаваў чыіх-небудзь дзеянняў, апынуўся на месцы правядзення шэсця выпадкова.

На пытанне дзяржаўнага абвінаваўцы ці карыстаўся мужчына мабільным тэлефонам, Мікіта Аўдзік адзначыў, што каля паўтары гадоў не мае мабільніка, не лічыць гэта вельмі абавязковым.

На пытанне суддзі, чаму мужчына, пераканаўшыся што мерапрыемства несанкцыянаванае, не развярнуўся і не сышоў з месца правядзення шэсця, Мікіта Аўдзік растлумачыў, што «калі выбраўся з натоўпу, заўважыў што запусцілі грамадскі транспарт, сеў на грамадскі транспарт і паехаў па сваіх справах».

На пытанне дзяржаўнага абвінаваўцы ці ўдзельнічаў ён у мерапрыемстве, абвінавачаны растлумачыў, што «быў падхоплены людзьмі пад рукі і ён апынуўся ў счэпцы». Таксама мужчына растлумачыў, што не выкрыкваў ніякіх лозунгаў і пры сабе ў яго не мелася якой-небудзь атрыбутыкі.

“Пакутуе на хранічны алкагалізм і не выплочвае аліменты”

Падчас абвяшчэння матэрыялаў крымінальнай справы стала вядома, што за пяць дзён да затрымання, 1 верасня, мужчыну асудзілі да 200 гадзін грамадскіх работ за ўхіленне ад выплаты аліментаў на свайго сына. Мікіта Аўдзік растлумачыў, што ўдзельнічае ў выхаванні свайго сына, крымінальная справа ў дачыненні да яго была распачатая пасля

ўтварэння запазычанасці па аліментах у памеры 1200 рублёў з-за таго, што ён шукаў працу, якая б адпавядала яго графіку і задавальняла па памеры зарплаты.

Падчас абвяшчэння матэрыялаў крымінальнай справы таксама стала вядома, што 31 траўня 2021 года ў дачыненні да яго было прынятае рашэнне суда аб накіраванні ў ЛПП у сувязі са злоўжываннем алкаголем.

Згодна з заключэннем судова-псіхіятрычнай экспертызы абвінавачваны пакутуе хранічным алкагалізмам і мае патрэбу ў прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння.

У матэрыялах справы маюцца звесткі аб знаходжанні абвінавачанага на ўліку ў нарколага з 2015 года і псіхіятра з 2020 года. Абвінавачаны знаходзіцца на ўліку а Кастрычніцкім РАУС Гродна як асоба, якая ўчыняе правапарушэнні ў сферы сямейна-бытавых адносін.

Пракурор абвясціла дадзеныя аб тым, што ў адносінах да Мікіты Авдик выносілася ахоўнае прадпісанне тэрмінам на 20 сутак, на працягу якіх ён абавязаны быў не з'яўляцца на працягу гэтага часу па адрасе пастаяннай рэгістрацыі.

Як растлумачыў сам абвінавачаны, ён парушаў дадзенае Прадпісанне, паколькі *"заходзіў дадому памыцца, пераапрануцца"*.

Суддзя задаў пытанне: *«На час ахоўнага прадпісання вам давалася месца пражывання?»*

Абвінавачаны: *"Не, прыйшлі, паставілі перад фактам каб столькі-та часу не з'яўляўся дома, спытаў "Як мне наогул дзе жыць? , сказалі - жыві як хочаш"*.

Суддзя ўдакладніў: *"І дзе вы жылі?"*.

Мікіта Аўдзік адказаў: *"У сяброў, у знаёмых, дадому забягаў пераапрануцца, памыцца і прыняць душ"*.

Суддзя ўдакладніў, ці ладзіў скандал Мікіта Аўдзік у момант знаходжання па месцы рэгістрацыі. Мікіта Аўдзік растлумачыў, што не рабіў скандалу, а на выхадзе з дому яго сустрэлі супрацоўнікі міліцыі, якія як раз прыехалі правяраць яго.

У ходзе судовага пасяджэння вывучаўся відэазапіс падзей, на якім быў бачны абвінавачаны. У сувязі з тым, што ў Мікіты Аўдзіка дрэнны зрок, суддзя паднёс ноўтбук да самой клетцы, пасля чаго ўключыў запіс. Мікіта Аўдзік не адмаўляў факту таго, што менавіта ён там бачны.

Сведкі з боку абвінавачання на суд не з’явіліся

Сведкі **Сяргей Цімафееў** і **Мікалай Задорын** накіравалі ў суд заявы аб немагчымасці яўкі ў судовае пасяджэнне ў сувязі са знаходжаннем за межамі горада Гродна па службовых пытаннях, папрасіўшы абвясціць дадзеныя імі паказанні падчас папярэдняга следства.

У адрас суда таксама было накіравана паведамленне намесніка камандзіра АМАП УУС Гродзенскага аблвыканкама палкоўніка **Сяргея Жучкова**, у якім пазначана, што сведкі **Валянцін Сташэўскі** і **Ала Сафонава** не могуць з'явіцца ў судовае пасяджэнне для дачы паказанняў сведак у сувязі са знаходжаннем Сташэўскага за межамі горада і знаходжаннем Сафонавай на лістку непрацаздольнасці. Яўка дадзеных сведак была прызнаная важнай, суддзя абвясціў дадзеныя імі на стадыі дасудовай вытворчасці паказанні, сутнасць якіх зводзілася да агульных звестак аб тым, што грамадзян, якія сабраліся на Маршы адзінства, інфармавалі аб наступствах у выглядзе адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве і гвалце ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі.

Пракурор падкарэктавала абвінавачанне

Падчас судовых спрэчак 7 снежня дзяржаўны абвінаваўца адзначыла, што абвінавачванне падлягае карэкціроўцы, з яго падлягае выключэнню ўказанне на папярэднюю змову дзеянняў абвінавачанага. Алена Пронька таксама адзначыла, што акрамя парушэння грамадскага парадку, *"сваімі дзеяннямі грамадзяне свядома падвышалі ўзровень напружанасці ў грамадстве, распальвалі нянавісць да прадстаўнікоў дзяржаўнай улады"*.

Пракурор папрасіла суд прызнаць у якасці змякчальнай акалічнасці чыстасардэчнае раскаянне абвінавачанага і папрасіла суд прызначыць пакаранне з улікам паглынання больш мяккага пакарання ў выглядзе 200 гадзін грамадскіх работ больш цяжкім у выглядзе **пазбаўлення волі на тэрмін 1 год 3 месяцы і прымяніць да яго меры бяспекі і лячэння ад хранічнага алкагалізму па месцы адбыцця пакарання.**

Абвінавачаны ў спрэчках сказаў, што ён шчыра раскайваецца ў зробленым і папрасіў з мяккасцю паставіцца да яго падчас вынясення прысуду.

У апошнім слове Мікіта Аўдзік сказаў:

> *"Я шчыра раскайваюся ў зробленым, у тым, што адбылося. Атрымалася так, што я выйшаў не ў той час і не ў тым месцы апынуўся. Я не збіраўся туды ісці і нешта камусьці даказваць такім шляхам. Для мяне гэта з'яўляецца шокам. Я не чакаў такога. У далейшым я не буду паўтараць такіх памылак".*

Суддзя Уладзімір Пазняк 7 снежня вынес прысуд: **адзін год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму,** таксама прымяніць да абвінавачанага прымусовыя меры бяспекі і лячэння ад хранічнага алкагалізму; канфіскаваны падчас ператрусу ноўтбук вярнуць па прыналежнасці маці абвінавачанага, вопратку, у якой знаходзіўся ён на акцыі пратэсту, вярнуць і залічыць у тэрмін адбыцця пакарання ўтрыманне ў ІЧУ з 6 па 16 верасня, а таксама ўтрыманне пад вартай з 17 верасня да вынясення прысуду.

Опубликовать





За ўдзел у акцыі пратэсту ў Мінску асудзілі палітзняволеную Галіну Лагацкую (дапоўнена)

У Жлобіне за тыдзень – тры суды за ўдзел у акцыях пратэсту ў 2020 годзе

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 23 траўня па 14 чэрвеня

Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі


Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

ГАЛОЎНАЕ



Патрабуем адмяніць прысуд у дачыненні да Леаніда Судаленкі, спыніць дзяржаўнае самавольства і пераслед праваабаронцаў





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Пяць гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму і вялізны штраф: прысуд праваабаронцу Леаніду Судаленку

Затрыманне, спецвытворчасць, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 21 чэрвеня

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

Ліквідацыя грамадскіх арганізацый, новыя затрыманні: хроніка пераследу 20 чэрвеня (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Франаку Вячорку прызначылі 20 гадоў пазбаўлення волі

Магілёўскую керамістку асудзілі на 1,5 года калоніі за перасланае

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY